Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 2 Вільня, Субота 2-га красавіка 1927 г. Год I

Як разабрацца?

Пры вялікай лічбе беларускіх партыяў і груп, якую бачым цяпер у Заходняй Беларусі, — шмат каму можа быць цяжка разабрацца ў іх і знайсьці належны шлях для сябе. Усе гэтыя партыі і групы суляць народу розныя ласыя рэчы, дык, здаецца, усе яны—роўныя прыяцелі беларускага селяніна і работніка. Але, прыглядзіўшыся да іх уважлівей, пабачым, што—па-за пекнымі славамі — ў іх крыецца далёка не заўсёды такі-ж пекны зьмест...

Прыпомнім выбары ў Сойм і Сэнат у 1922 годзе. Колькі тады польскіх партыяў сулілі нам залатыя горы, абы толькі беларускае сялянства падавала за іх свае галасы! Асабліва вызначалася ў гэтым „Вызваленьне", якое і аўтаномію нам суліла, і абяцала „выгнаць асаднікаў", ды ўсю зямлю тутэйшым сялянам аддаць, і школу ў роднай мове дакляравала. А на дзеле—якраз „вызваленцы" аказаліся найвялікшымі абаронцамі асадніцтва, іх пасол Тугутт укладаў знамянітыя „языковыя законы", а аб аўтаноміі ў Сойме і гутаркі ніякае ня было... Такімі ж „прыяцелямі" аказаліся для нас і пэпээсаўцы.—Дык пекныя словы мала нам далі!

Такімі ж пекнымі славамі кормяць нас цяпер і розныя беларускія сельсаюзьнікі, хадэкі, эсэры і іншыя, згуртаваныя на груньце супольнага імкненьня павадыроў іх здабыць сабе пасольскія мандаты на новых выбарах.—Дык як-жа распазнаць, хто з іх наш вораг, а хто прыяцель працоўных?

Мы будзем пры ацэнцы партыяў і палітычных кірункаў карыстацца гэткай меркай. Ясна для ўсіх, што ў жыцьці грамадзянства не адзінкі, але масы вырашаюць асноўныя пытаньні грамадзкага жыцьця. У часе выбарнае кампаніі, ня шукаючы іншых прыкладаў, вырашае пытаньне аб перамозе таго ці іншага сьпіску—*настрой масы*, які і выяўляецца ў лічбе пададзеных выбарных картачак. Але, каб народ не памыліўся, ён мусіць быць *сьвядомы і добра з'арганізаваны*. Ен мусіць прывучыцца да супольных, згодных, арганізаваных выступленьняў,—мусіць разьвіць у сабе *актыўнасьць*. Дык вось, мы будзем верыць у шчырасьць і палітычную чэснасьць толькі тых партыяў, якія імкнуцца да *разьвіцьця актыўнасьці беларускіх масаў*, а не да таго, каб па сьпінах сялян і работнікаў дабрацца ў Сойм і, седзючы на мяккім пасольскім крэсьле, прадаваць пасьля інтарэсы сваіх выбаршчыкаў, заклікаючы іх адначасна—„ня рыпацца"...

Другая мерка наша — гэта справа *еднасьці інтарэсаў працоўных*, незалежна ад таго, ці яны аруць зямлю, ці стаяць ля фабрычнага станка. Партыі, якія жадаюць дабра не народу, а толькі сабе—сваім павадыром, як агня баяцца гэтае еднасьці: яны ведаюць, што параскіданыя на вялізарных прасторах сялянскія масы, ня маючы сувязі з работнікамі места, зьяўляюцца бязраднымі і бяссільнымі ў руках розных палітычных спэкулянтаў,—дык і стараюцца *пасварыць сялян з работнікамі*, каб цалком забраць вёску пад сваю „апеку". Наадварот, калі сялянства будзе йсьці поруч з работнікамі, дык у яго будзе ў месьце *магутны саюзьнік*, які выкрые і разаб'е ўсе хітрыя штукі палітычных спэкулянтаў, што жыруюць на народным целе і прадаюць інтарэсы працоўных і вёскі і места.

Вось мы і будзем мерыць партыі і палітычныя кірункі ў нашым грамадзянстве гэтымі дзьвюма меркамі. А хто пад іх не падойдзе, за тым маса ня пойдзе: *панаваць над сабой* яна нікому ня дасьць!

Польска-радавыя перагаворы.

Польскі пасол у Маскве спэцыяльна, як аказываецца, прыяжджаў у Варшаву, каб атрымаць ад свайго ўраду інструкцыі ў справе перагавораў аб заключэньні „гарантыйнае ўмовы з ССРР.

Мы падалі ўжо некалькі вестак аб важных нарадах у Варшаве ў гэтай вельмі важнай справе, у якіх прымаў учасьце і радавы пасол у Варшаве — Войков. Газэты пішуць, быццам удалося на гэтых нарадах дайсьці да пэўнага паразуменьня, у выніку якога істнуе надзея, што важны для абедзьвюх старонаў трактат можа стацца фактам. У кожным разе пэўна, што, зараз-жа пасьля павароту польскага пасла ў Маскву, там распачнуцца перагаворы аб гэтым „пакце прыязьні" ды ўзаемнай гарантыі.

Як ведама, гэтыя перагаворы распачыналіся ўжо няраз і маюць сваю даўгую гісторыю. Але дагэтуль кожны раз яны зрываліся дзеля таго, што Польшча дамагалася заключэньня „агульнага і супольнага трактату" між усімі балтыцкімі дзяржавамі з Польшчай наперадзі — з аднаго боку, і Радамі — з другога. Але Рады рашуча адкідалі гэты варунак, прапануючы кожнай балтыцкай дзяржаве — асобныя трактаты. Як тлумачыў Чычэрын, ССРР зусім ня хоча гэткім шляхам рабіць Польшчу фактычным „павадыром Балтыцкіх дзяржаў", да чаго яўна і сьведама імкнулася польская палітыка... Але на асобны трактат не згаджалася Польшча. Так справа цягнулася без канца.

Цяпер, пасьля таго, як радавай дыпляматыі ўдалося прабіць наскрозь „супольны фронт" балтыцкіх дзяржаў, падпісаўшы асобныя ўмовы з Літвой і з Латвіяй, „балтыцкая палітыка" Польшчы зрабілася папросту недарэчнасьцяй: І ніводная балтыцкая дзяржава ня толькі ня лічыцца з імкненьнем польскае палітыкі да польскага павадырства над Балтыкай, ды ўсе — адна за аднэй — ужо адмовіліся ад „байкоту" ССРР — паводле англійскага рэцэпту. Нарэшце і Польшча — апошняя! — зразумела правал сваей проціpадавай палітыкі над Балтыкай і — выразіла гатоўнасьць прадаўжаць перагаворы...

Ці што выйдзе з гэтых перагавораў — у зьвязку з сучаснай агульнай „палітычнай шахаўніцай" на сьвеце, а перадусім — з сусьветным паедынкам Англіі з ССРР, у якім Польшча стаіць на англійскім баку, — цяжка сказаць. Трэба ў кожным разе сцьвярдзіць і тут далейшы пасьпех радавай дыпляматыі, якая радам папярэдніх крокаў дабілася таго, што ўвесь адзіны „англійскі фронт" на яе заходняй граніцы рассыпаўся на кусочкі.

Пасьля перамогі Кантонцаў.

Пасьля заняцьця Шанхаю.

Як мы пісалі ў папярэднім нумэры, кантонскай арміі, пасьля ўзяцьця „кітайскага Шанхаю", астаецца яшчэ—да поўнага вызваленьня ўсяго Паўдзённага Кітаю — вырашыць аканчальна пытаньне аб паўнаце дзяржаўнай улады Кітаю над „чужаземным Шанхаем", у якім, апрача чужаземцаў з іх будынкамі ды маемасьцямі, каштуючымі некалькі мільярдаў даляраў, жыве каля паўтара мільёна кітайцаў. Гэтую неабходную і неадкладную справу можна было б вырашыць цяпер шляхам мірнага дагавору, як гэта зроблена з м. Ханькоў. Але, як відаць, чужаземныя жываеды, прывыкшы панаваць у Кітаі, як у сябе дома, ды узмацаваўшы значна свае сілы, пастанавілі — „бараніць свой Шанхай"—да апошняй кроплі крыві, зразумела-ж—кітайскай...

Тэлеграмы кажуць, што англійцы, амэрыканцы і японцы пастанавілі дзеяць супольна і аб'яднана—пад галоўнай камандай англійскага генарала Дугляса. Амэрыканскі адмірал Вільямс высадзіў усе войска з караблёў на шанхайскі бераг, ды затэлеграфаваў да ўраду, каб сьпешна высылаў—новую падмогу... І вось, у Шанхай ідуць усё новыя караблі—амэрыканскіх 3, японскіх 5, італьянскіх—2, ды ўсе з войскам...

Страшэнна завастрыла адносіны між Кантонам і Амэрыкай страшэнная разьня чужаземцаў у Нанкіне—ў часе пераходу яго ў рукі кантонцаў. Англійскія газэты расьпісываюць кітайскія зьверствы ў Нанкіне, даводзячы—ведама ж,—што ўсе яны зроблены кантонскімі жаўнерамі; англійскія карэспандэнты пішуць так сама аб страшэнных гвалтах, якія здарыліся ў францускай канцэсіі, дзе консул прасіў помачы — ў англійцаў... Быццам наагул францускія грамадзяне і ўлады ў Кітаі аддаліся цалком пад англійскую апеку. Дык вось, вельмі цікаўна, што проці ўсей гэтай хлусьні страшэнна абурылася ўся француская прэса, якая мае так сама сваіх карэспандэнтаў у Паўдзённым Кітаі. Францускія газэты пішуць, што — праўда—разьня ў Нанкіне была страшэнная, але што гэта рабілі зусім не кантонскія войскі, але якраз—„пабедна адступаўшыя паўночныя арміі", ці можа тая мястовая галота-галыцьба, якая скарыстала з мамэнту зьмены ўлады. Але якраз уваход кантонцаў ураз жа спыніў усю гэтую вакханалію, моцнай рукой устанавіўшы парадак. Так сама—хлусьня тое, што пішуць англійцы аб французах: ніякога пагрому францускай канцэсіі ў Нанкіне ня было, ніколі францускія ўлады не зварачаліся да англійскіх, просячы абароны ды апекі... Гэта ўсё, як паведамляе карэсп. „Кур. Варшаўскага", сцьверджана ў урадавых францускіх крыніцах...

Наадварот, адносіны Францускай улады з Кантонам наагул добрыя, і на чарзе дня стаіць справа аб асобным паразуменьні між імі. З гэтага відаць, што Францыя мо' й ня будзе прымаць учасьця ў супольнай апэрацыі чужаземцаў у Шанхаі. За тое быццам рашуча зьмяніла сваю тактыку адносна да Кантону Японія. Можа ўстрывожаная паражэньнямі „свайго" Чанг-Тсо-Ліна яна хоча падбіць кантонцаў, каб кінулі думку — аб далейшым наступленьні на поўнач?!... Толькі што Японія кінула ў Шанхай амаль ня ўвесь свой флёт...

Кантонская ўлада ў Шанхаі.

Камандзір шанхайскай арміі ген. Пай заявіў, што кантонцы будуць у Шанхаі аднолькава ахоўваць усе слаі насяленьня—як работнікаў, так сама і буржуазію, не даючы нікому ніякай самаволі, а так сама — ніякіх прывілеяў.

Рашучая пастанова ўладаў у Шанхаі.

У Шанхаі адбылася нейкая важная нарада—ў справе далейшай барацьбы за Шанхай. На нарадзе былі прысутны галоўны камандзір усіх кантонскіх арміяў Чанг Кай-Шэк і камандзір шанхайскай арміі ген. Пай-Чынг-Хсі. Прынята пастанова безадклана браць усімі спосабамі „чужаземны Шанхай".

Ультыматум кантонцаў.

Амэрыканскае агенцтва паведамляе, што камандзір кантонскіх войск у Шанхаі рашуча патрэбаваў, каб чужаземныя ўлады раскінулі ўсе тыя барыкады ды ўкрапленьні, якімі яны аддзялілі чужаземную частку места ад кітайскай. Пры гэтым кантонскі камандзір заявіў, што бярэ на сябе поўную адказнасьць за ахову і нятыкальнасьць усіх чужаземцаў і іх маемасьцяў. Гэты ўльтыматум кантонскага генарала падтрымалі рашуча і салідарна ўсе аб'яднаныя работніцкія арганізацыі „чужаземнага Шанхаю", якія зьвярнуліся ў яго „Мястовую Раду" (амаль ня выключна экспазытура англійскіх фабрыкантаў!) з заявай: калі гэта ня будзе зроблена, дык яны распачнуць — агульную забастоўку...

Быццам чужаземныя ўлады далі на ўльтыматум рашучую адмову.

З гэтага рашучага кроку, пакуль што— „дыпляматычнага", — відаць, што на мірны выхад з палажэньня надзеяў вельмі мала.

Грозная перасьцярога Кантона.

Галоўны камандзір кантонскіх арміяў Чанг Кай-Шэк зрабіў заяву шанхайскім журналістам, у якой грозна перасьцерагаў амэрыканскі ўрад, каб не паддаваўся падшэптам Англіі; каторая яўна хоча ўцягнуць амэрыканцаў у авантуру, якая можа іх паставіць у Кітаі ў такое ж палажэньне, як Англійцаў. У тым, што пры ўзяцьці Нанкіна пацярпела шмат чужаземцаў, вінаваты яны самі, — бо яны самі стралялі ў кантонскія войскі, зрабіўшы гэтым сябе—ваюючай старанай. Амэрыканцы павінны рашуча адгарадзіцца ад англійцаў, не падтрымліваць іх аружнай сілай. Тады кантонскія ўлады

Абшарніцкая праграма у беларускай справе.

У той дзень, як у прэсе было зьмешчана ўрадавае абвяшчэньне аб прызнаньні Грамады „нелегальнай" і „забароненай" партыяй, — абшарніцкае „Слово" шчыра і адкрыта высказала пагляд польскага абшарніцтва (якое, нажаль, з кожным днём усё вышэй падымае галаву ў Польскай Рэспубліцы) — на беларускую справу. Мы вельмі ўдзячны абшарніцкаму органу: пасьля ягонага выступленьня шмат трудней будзе баламуціць беларускія масы розным „Беларускім Днём", „Сялянскім Нівам" ды „Крыніцам"...

Падаем даслоўна заяву гэтага органу „прыяцеляў незалежнасьці" беларусаў....

...„**Не ўстаноўлена, ці беларускі язык—гэта язык.** Беларусь выявіла адносна вельмі мала сілаў і самастойнасьці, калі раўнаваць з літвінамі ці з украінцамі. Тэрыторыя Палесься прадстаўляе абасобленую цэласьць. У інтарэсах нашае (польскае!) палітыкі трэба захаваць абасобленасьць гэтае тэрыторыі".

...„Шырокая разьвязка беларускага пытаньня магчыма толькі валадаючы Менскам і Магілёвам. Тады можам ісьці на тварэньне **польска-беларускае дзяржаўнасьці** (—а не беларускае, паны сельсаюзьнікі і хадэкі!—*Рэд.*).

„Ня маючы Менска і Магілёва, ня можам весьці такое палітыкі, як калі-б іх мелі.

„Сягоньня беларусы маюць вельмі мала нацыянальных сілаў (—пэўне-ж, бо добрая палова іх зачынена ў вастрогах!—*Рэд.*). Нацыянальную сьвядомасьць яны пашыраюць, будзячы апазіцыю проці польскага гаспадарства. Уступкі, якія гаспадарства можа ім даць, ня маюць для іх вартасьці, бо ў іх няма даволі культурных сіл, каб выкарыстаць гэныя ўступкі. Наадварот, шляхам шырэньня апазіцыі проці гаспадарства, яны знаміта пашыраюць свае ўплывы (—хто „яны" тыя, каго няма?—*Рэд.*).

„Наша пазытыўная праграма ў адносінах да беларусаў, — праграма на-жаль малая, — **не магла** грунтавацца на прызнаньні ім **нацыянальна-тэрыторыяльнай аўтаноміі.** Такая аўтаномія адарвала бы ад Польшчы тыя паветы, дзе беларусы складаюць большасьць. Адарвала-бы ад Польшчы і далучыла-бы да Беларускае Радавае Рэспублікі.

„Праграма гэтая павіна грунтавацца на:

1) **Нестаўляньні перашкодаў апалячываньню** тых беларусаў, якія горнуцца да польшчыны. Увядзеньне нацыянальных курыяў было-б такой перашкодай. Недапусканьне да ўрадаў і ўнівэрсытэтаў—гэта таксама перашкоды.

2) На шырокай праграме матар'яльных інвэстыцыяў і паляпшэньні нашае адміністрацыі на беларускіх землях (—ф', панове! Няўжо-ж вы ня ведаеце, што польская адміністрацыя на Беларускіх землях—ідэальная?!—*Рэд.*).

3) На **„незражаньні" да Польшчы** тых беларусаў, якія зьяўляюцца шчырымі **ворагамі бальшавікоў.**

4) На пасыўным, наглядальным становішчы ў адносінах да тварэньня сьвядомасьці і культуры беларускай,—становішчы прыхільна-нэйтральным (—о, так: з „прыхільнасьцяй" мы лішне добра знаёмы.... *Рэд.*).

Калі прыпомнім, што „Слово" зьяўляецца органам наймагутнейшага сягоньня ў урадзе марш. Пілсудскага міністра — пана Мэйштовіча, дык значэньне стацьці „Слова" набірае для нас падвойнае вагі....

гарантуюць ім поўную бясьпечнасьць у Кітаі. Кантонскія ўлады гатовы ў кожны мамэнт распачаць перагаворы з чужаземнымі ўрадамі—аб новых з імі ўмовах, але справа адбудовы незалежнасьці і адзінства Кітаю—гэта ўнутраная справа Кітаю, у якую чужаземцы не павінны мяшацца.

Што ўзялі кантонцы ў Шанхаі.

Як ведама, Шанхай быў узяты бяз бою—шляхам „узрыву" знутра. Гэткім чынам у рукі кантонцаў папала: 15.000 палонных жаўнераў паўночнай арміі, 50 гарматаў ды шмат ружжаў.

Эвакуацыя чужаземцаў з Нанкіна і Ханькоў

Амэрыканскія ўлады пастанавілі вывезьці ўсіх сваіх грамадзян з усіх абшараў, занятых кантонскай арміяй. Тое-ж самае маюць хутка зрабіць і англічы... А вось французы дык сабе сядзяць і выяжджаць ня зьбіраюцца.

Паход на Пэкін.

Генарал Чанг-Кай-Шэк пацьвярдзіў, што кантонская армія пачала рашучую падгатоўку да вялікага паходу на Пэкін, каб дасягнуць аканчальнай мэты кантонскага нацыянальнага ўраду—аб'яднаньня і вызваленьня ўсяго Кітаю. Уся апэрацыя мае быць распачата ў шырокім маштабе — ў паразуменьні з арміяй ген. Фэнга, — ў апоры аб Манголію. Адна армія мае ісьці ўздоўж чыгуначнай лініі Нанкін-Пэкін, другая—уздоўж узьбярэжжа праз прав. Шантунг. Гэта — з паўдня. Адначасна трэцяя армія падсунецца да Пэкіна з Захаду; гэта — армія ген. Фэнга, які ўжо мае 200.000 жаўнераў, набраных у Манголіі. Магчыма, што гэтая апэрацыя выклікча сутычку з ген. Чанг-Тсо-Лінам, бо, пасьля ўзяцьця Пэкіна, трэба будзе неяк заапекавацца і Манджурыяй..

Навет у Лёндане, які толькі што цкаваў Чанг Тсо Ліна на паход процi Кантону, занепакоіліся „небясьпекай, пагражаючай становішчу Чанг-Тсо-Ліна ў Манджурыі".

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Пастанова ўрадавай „арбітражнай камісіі".

Урадавая „арбітражная камісія", якой лодзкія работнікі згадзіліся—пад уплывамі „апазыцыйных" пэпэсаў — аддаць на суд свой канфлікт з фабрыкантамі, спыніўшы раптам так шырока распачатую забастоўку і тым значна аслабіўшы сваю пазыцыю ў барацьбе за лепшыя заробкі, — толькі-што абвясьціла свой прыгавор.

На дамаганьне работнікаў падняць плату накруг на 25 проц. камісія адказала так: падзяліла ўсіх работнікаў на 5 групаў — паводле іх цяперашняга заробку дый прызнала дадаткі ім — у размеры ад 5 да 12 проц. Дадаткі абліканы, што ў сярэднім кожны работнік усіх групаў атрымае дадатку каля 30 — 35 грошаў у дзень.

Сам „Роботнік" сьцьвярджае, што „арбітражная пастанова" прынцыпова адыйшлася ад дамаганьняў работніцкіх арганізацыяў, пад варункам выпаўненьня якіх, як пісаў тады той-жа „Роботнік", гэтыя арганізацыі пастанавілі спыніць забастоўку... Аб усіх іншых трэбаваньнях работніцкіх арганізацыяў, аб якіх так гучна пісаў у часе забастоўкі „Роботнік", арбітражная камісія не ўспамінае. У канцы пастанова кажа, што за самы факт баставаньня работнікаў ня можна выкідаць з работы. Як ведама, у склад камісіі ўваходзілі віцэ-прэм. Бартэль, як старшыня, і міністры прамысловасьці і працы, як сябры.

Да ўрадавага „арбітражу".

У той час, як урадавая прэса хваліць прысуд, як „здаволіваючы работнікаў", уся „яўна капіталістычная прэса зусім ня ўкрывае таго, што пастанова камісіі пайшла—па думцы прамыслоўцаў".

Так піша „Роботнік", тонка даючы паняць, што ён лічыць урадавую прэсу — „скрыта-капіталістычнай".

У справе заграніччнай пазыкі.

29 га сакавіка вярнуліся з Амэрыкі дэлегаты Польскага Банку і ўраду, якія езьдзілі туды ў справе пазыкі, хаця афіцыяльна мэтай падарожы абвешчана—нарада іх з праф. Кемэрэрам. 30-га адбылася нарада ў мін. скарбу, на якой дэлегаты зрабілі даклад аб сваей падарожы. „Robotnik" даведаўся, што дэлегаты наагул здаволены з вынікаў прдарожы, хаця праф. Кемэрэр зказаўся — у.. Паўдзённай Амэрыцы, а ня ў Нью-Іорку. Быццам—„справа пазыкі дзеля ўмацаваньня польскай валюты стаіць на добрай дарозе".

Што „на добрай дарозе", гэта—пэўна-ж добра, але вось, што стаіць, гэта—ужо горш.

Звальненьне з вастрогу Мурашкі.

Былы паліцыянт Мурашка выпушчаны — на падставе „амністыі мін Мэйштовіча" — з вастрогу.

Як ведама, Мурашка забіў двух людзей — былых польскіх афіцэраў камуністаў, якіх польскі ўрад, з згоды пана Прэзыдэнта, высылаў, як „палонных", у абмен на „заложнікаў" у СССР, дый якіх, безбаронных, ён як паліцэйскі ўрадавец, азброены да зубоў, эскортаваў — да граніцы... За гэта Мурашка быў засуджаны, здаецца, штосьці на 2 гады, але — з залічкай арышту, выйшла ўсяго некалькі месяцаў. Цяпер яму ставалася сядзець ужо зусім мала...

Арыштаваньне трох жыдоўскіх журналістаў.

У Варшаве, у часе публічнай лекцыі ў Саюзе Жыдоўскіх Літэратараў, у салю ўвайшлі паліцыянты і арыштавалі двух жыдоўскіх літэратараў і тэатральнага дзеяча Мазэ з Вільні. На запытаньне старшыні Саюзу паліцыянты не адказалі, на падставе якога загаду яны робяць арышт. Сярод варшаўскіх жыдоўскіх літэратараў—вялікае хваляваньне.

Разгон украінскай маніфэстацыі процi Чэха-Славакіі.

Паліцыя разагнала дэманстрацыю украінцаў, якія сабраліся перад гмахам чэхаславацкага консульства ў Львове, каб пратэставаць процi ўціску украінцаў у Прыкарпацкай Русі.

Як відаць, „славянолюбства" чэскага гаспадарства істнуе толькі дзеля замежных „братоў-славянаў".

Зьезд дэлегатаў Саюзу Дзяржаўных Урадоўцаў.

Два дні засядаў зьезд дэлегатаў Саюзу Дзярж. Урадоўцаў. Вынесены ў канцы рад рэзалюцыяў, паміж якімі—дамаганьне адбудовы рэальных заробкаў з канца 1925 г. і іншыя трэбаваньні паправы матэрыяльнага быту. На зьездзе быў прысутны з міністраў толькі адзін—унутраных спраў ген. Складкоўскі, не гледзячы на тое, што абяцалі быць—віцэ-прэм. Бартэль і іншыя міністры.

Заграніцай.

Літва выступае з Лігі Народаў?

Як падаюць польскія газэты, у рыжскай прэсе зьявілася нязвычайна сэнсацыйная вестка, быццам галоўны сэкратар Лігі Народаў атрымаў ад літоўскага ўраду паведамленьне, што Літва з дня 1 красавіка выступае з Лігі Народаў.

Паводле тэй-жа польскай прэсы, з Коўны атрымана вестка, што пацьверджаньня гэтае навіны яшчэ няма. Ведама толькі напэўна, што ковенскі ўрад скасаваў становішча спэцыяльнага прадстаўніка Літвы пры Лізе Народаў.

Калі ўсё гэта праўда, дык прыдзецца зрабіць вывад, што англійская палітыка, якая выклікала ў Літве фашыстаўскі пераварот, ашукалася і прайграла сваю справу ў Балтыцы наагул. Тады і Латвія пэўне пойдзе па сьлядох Літвы...

„Балтыцкі пасол Англіі" ў Коўні.

Нямецкая прэса, паведамляючы аб прыезьдзе ў Коўну з Рыгі англійскага пасла на ўсе балтыцкія дзяржавы, дадае, што пасол мае даручэньне ад свайго рашуча націснуць на літоўскі ўрад, каб прысьпешыць яго паразуменьне з польскім, якое цяпер зьяўляецца — падставай англійскай палітыкі на Усходзе Эўропы.

Ці не запозна?!

Камуністычная акцыя ў Літве.

Галоўны камандзір літоўскай арміі ген. Жукаўскас заявіў журналістам, што—пасьля перавароту 17 сьнежня—камуністычная дзеяльнасьць у Літве на якісь час была прыпынілася. Але цяпер агітацыя камуністаў ізноў узмацавалася, асабліва сярод жаўнераў у арміі. Генарал запярэчыў весткам аб масавых арыштах у адным з „няпэўных" палкоў, дый наагул пераканаты, што паважнай небясьпекі бальшавіцкая агітацыя ў Літве не прадстаўляе.

Мабілізацыя ў Альбаніі.

З Белграду паведамляюць, што альбанскі ўрад, якому пагражае паўстане, робіць ваенныя падрыхтаваньні, як бы да праўднай вайны. Шмат італьянскіх гарматаў пастаўлена на важных стратэгічных пунктах. А ў апошнія дні абвешчана мабілізацыя аж 4 гадоў запасных.

Злагоджаньне італьянска - югаслаўскага канфлікту.

Апошнія весткі кажуць, быццам канфлікт паміж Югаславіяй і Італіяй пачынае неяк лагодзіцца. Ведама, што за плячымі Італіі стаіць Англія, якая правакуе яе на вайну ды на розныя захваты. Югаславія мае абаронцу ў Францыі. Дык, відаць, дайшло

Палітыка Італіі на Балканах.

Яшчэ, здаецца, жывуць людзі, якія памятаюць гэраічную барацьбу італьянцаў з Габсбургскай манархіяй за вызваленьне спад аўстрыяцкага ярма, — а вось цяпер, пасьля развалу Аўстра-Вэнгерскай імпэрыі, яе ролю—ролю захватчыка балканскіх народаў—узяла на сябе фашыстаўская Італія. Дый — ці-ж з аднэй Італіяй на нашых вачох зрабілася гэткая агідная перамена?!.

Італія ад самага свайго вызваленьня і аб'яднаньня заўсёды лічыла Альбанію ў ліку—„сваіх няверненых на лона Мацежы" зямель. І вось цяпер, калі таксама „італьянскі" Эпір апынуўся ў граніцах Грэцыі, Італія пастанавіла захапіць Альбанію, — тым больш, што лічыць сябе вельмі пакрыўджанай магутнейшымі саюзьнікамі, якія ў падзеле ваеннае дабычы ашукалі яе вялікія апэтыты...

Дагэтуль, аднак-жа, Альбанію трымалі неяк у стане „незалежнасьці" Англія і Францыя, а перадусім баранілі яе Югаславія і іншыя балканскія дзяржавы, вельмі баючыся такога магутнага суседа на Балканах, як Італія. Але ад часу ўпадку міжнародавай сілы Францыі, а перадусім — толькі-што заключанага нейкага сэкрэтнага дагавору між Італіяй і Англіяй, італьянскі ўрад, як цяпер ужо зусім ясна, атрымаў ад англійскага — поўную „свабоду рук", ці прасьцей: дазвол грабіць сярод белага дня—на Балканах і на Блізкім Усходзе (—у Малай Азіі). Першым крокам гэтай новай захватнай палітыкі італьянскага фашызму і зьяўляецца яўна распачатая на нашых вачох цынічная акцыя — ваенна-дыпляматычнага захвату Альбаніі.

Трэба аддаць справядлівасьць дыпляматычнай штуцы Мусоліні, які вельмі спрытна вядзе ўсю гэтую акцыю. Першым чынам ён настрашыў францускую дыплематыю — пагрозай захапіць францускія валаданьні ў Афрыцы, у якіх мейсцамі запраўды больш італьянцаў, як французаў. Нейкі час трываў нейкі навет паў-ваенны стан між абыдвума краямі; на граніцы былі сабраны з абодвух бакоў—статысячныя арміі... Гэткім чынам, калі высьнілася, што Італія хоча захапіць толькі Альбанію, дык Францыя—на пратэсты з боку Югаславіі і крык аб дыпляматычнай дапамозе—адказала толькі „ўздохам палёгкі"... Гэткім чынам Мусоліні забясьпечыў сабе „нейтралітэт" абедзьвюх наймагутнейшых эўрапэйскіх дзяржаваў у часе ўсей яго акцыі ў Альбаніі.

Трактат з падкупленым альбанскім урадам—спосабам шляхотнай Англіі—фактычна аддаваў Альбанію пад высокую руку Мусоліні і зламаў дагавор з Югаславіяй, які забясьпечываў раўнавагу ўплываў абедзьвюх дзяржаваў у Альбаніі. — Гэты трактат быў першым яўным „юрыдычным" крокам да поўнага захвату Альбаніі. Але гэты крок дарэшты абурыў Югаславію, якая, як пішуць, пастанавіла дамагацца адбудовы свайго ўплыву ў Альбаніі ўсімі мерамі, не выключаючы і — ваенных... Тады Мусоліні трэба было стварыць такія варункі для Югаславіі, каб яна не магла і думаць аб якойсь барацьбе з Італіяй. Як ведама, найлепшы спосаб у такім выпадку — гэта, як кажуць, ізаляваць (абасобіць, пазбавіць саюзьнікаў) праціўную дзяржаву, а сабе, наадварот, прыдбаць саюзьнікаў, якія могуць найбольш пагражаць праціўніку з усіх бакоў. Гэтых саюзьнікаў найвыгадней шукаць сярод суседзяў праціўнае дзяржавы. Так акурат і зрабіла Італія, вядучы дыпляматычную кампанію ў кірунку ізаляцыі Югаславіі. І вось, пачарзе Мусоліні здабывае сабе прыхільнікаў сярод амаль ня ўсіх беспасрэдных суседзяў Югаславіі: Альбанію ён папросту купіў; Румыніі „падараваў" Бесарабію; Грэцыю здолеў ізноў страшэнна пасварыць з Югаславіяй — у напалову ўжо быццам вырашанай грэцка-югаслаўскай спорцы аб Салоніках, абяцаўшы падтрымаць грэцкія дамаганьні процi Югаславіі. Што датычыць Баўгарыі і Вэнгрыі, дык у гэтых краёх яшчэ вельмі крэпка дзержыцца ненавісьць да Югаславіі, якую саюзьнікі пераможцы зрабілі „Вялікай" коштам былых баўгарскіх ды вэнгерскіх зямель, у дадатку яшчэ паставіўшы Югаславію першым „жандаром"—сьцерагчы ды пільнаваць пабітых баўгараў і вэнграў. Гэткім чынам Італія—з дазволу Англіі і Францыі — ізноў радыкальна зьмяняе палітычныя адносіны на Балканах: разваліваe Малую Антанту, вызваляе Вэнгрыю і Баўгарыю з-пад ваеннага дагляду Антанты, ды садзіць у вастрог — у „адзіночку" (ізаляцыю)—гэтага самага „жандара"...

Пэўна-ж, што ўвесь гэты варожы ланцуг навакол Югаславіі здолее зрабіць спробу барацьбы Югаславіі процi Італіі — безнадзейнай...

Гэткім чынам Мусоліні можа захапіць Альбанію, не праліўшы ніводнай кроплі крыві... Але-ж, ведама, калі будзе патрэбна, дык ён ня спыніцца і перад гэтым...

Толькі што ўсе гэтыя пляны Мусоліні пацьвярдзіў былы прэм'ер Альбаніі Фанолі, які заявіў у Вене, што ў хуткім часе Мусоліні мае аружнай сілай заняць Альбанію. Фанолі падаў процi гэтага скаргу-пратэст у Лігу Народаў.

Калі ўсё пойдзе так гладка, як думае Мусоліні, дык можа вайны і ня будзе. Але, калі Югаславіі ўдасцца паразумецца — пры дапамозе Францыі, а можа і СССР з сваімі суседзямі, тады Альбанскі захват, які так напамінае аўстрыйскі захват Босьніі, можа выклікаць на Балканах — новы ваенны канфлікт, які ізноў уцягне ў вайну ўсю Эўропу—каб ізноў перабудаваць на больш трываае недарэчны „вэрсальскі лад"...

Аб хатніх промыслах.

Найвялікшае багацьце кожнага народу—гэта яго творчыя сілы, як умысловыя, так і фізычныя. Абы толькі гэтыя сілы было да чаго прылажыць,—і народ можа ў неабмяжованым ліку тварыць цэннасьці, якія—шляхам мены — дадуць народу ўсё яму патрэбнае.

Галіта нашае вёскі ў Заходняй Беларусі, дзе пануе вялікі голад на зямлю, вынікае іменна з таго, што наш працоўны люд ня можа знайсьці прылажэньня дзеля сваёй працы. На ральлі — зашмат рабочых рук і зашмат едакоў, бо гэнае ральлі—лішне мала.

Радыкальная разьвязка зямельнага пытаньня ў Зах. Беларусі на шляху пашырэньня сялянскіх гаспадарак у такой меры, каб сялянства мела ў сябе прылажэньне для ўсіх сваіх сілаў,—гэта-ж эканамічная неабходнасьць. Але-ж спадзявацца на большменш радыкальную зямельную рэформу ў нашым краю пад Польшчай—ня прыходзіцца: „рэформа", якую праводзе сучасны ўрад, ня суліць нашаму сялянству бадай-што нічога,—і змаганьне за зямлю яшчэ доўга будзе адным з найбольш яркіх лёзунгаў беларускае вёскі.

Калі гэтае змаганьне закончыцца, — ня будзем гадаць. Адзначым толькі, што благое забясьпечаньне беларускае вёскі зямлёй прымушае шукаць магчымасьці прылажэньня народных сілаў да вытворчае працы — ў іншых галінах гаспадарчага жыцьця. А перадусім—у прамысловай вытворчасьці.

Вялікі промысел у нас ледзьве дыхае і ня можа даць працы сталым работнікам — хоць-бы найлепш выкваліфікаваным. Дык вёска лішку сваіх сілаў тут не спажыткуе. Вось і трэба зьвярнуць увагу на той від вытворчасьці, які здаўна істнаваў у нашых вёсках. Гэта — дробная, хатняя прамысловасьць.

Сялянскія хатнія вырабы ў нашым краю ведамы з вельмі добрага боку даўно. У 1913 годзе тут, у Вільні, адбылася нязвычайна багатая выстаўка народных хатніх вырабаў усяе Беларусі і Літвы, якая запоўніла вялізарную Мястовую Салю экспонатамі ажно да краёў. і тут мы бачылі сваімі вачыма, якім вялікім мастаком зьяўляецца наш народ—ці то ў галіне ткацтва, ці ў разьбе на дрэве, ці ў лепцы з гліны (ганчарстве), ці інш.

Цяпер усё гэта—вельмі падупала. Але на леташняй выстаўцы прыкладнога мастацтва ў Парыжу лідзкія гунькі ўсё-ж атрымалі пачэсную адзнаку, хоць фігуравалі там, як „вырабы польскага люду"... І разьвіваць хатнюю прамысловасьць мы маглі-бы — перадусім з увагі на тое, што—пры нашай здольнасьці — маем паддастаткам і патрэбны матэрыял: воўну, лён, каноплі—дзеля ткацтва, лясныя багацьці — дзеля рознага судзьдзя, аздобленага разьбой, гліну—дзеля ганчарства.

Паводле даных „Kwart. Statyst. за 1924 г. прадукцыяў чатырох беларускіх ваяводзтвах давала ільнянага валакна:

у Беласточчыне	—	88,971 цэнтн.
„ Віленшчыне	—	38 484 „
„ Наваградчыне	—	25,723 „
„ Палесьсі	— —	19,732 „

пры чым найлепшыя гатункі лёну—у Віленскім і Дзісьненскім паветах.

Паводле тых-жа даных, прадукцыя каноплі (валакна) давала:

у Беласточчыне	—	1,782 цэнтн.
„ Віленшчыне	—	1,773 „
„ Наваградчыне	—	829 „
„ Палесьсі	— —	472 „

Маем і сваю воўну, хаця гавец за час вайны ў нас паменшала. Гэта паказуюць цыфры да—і пасьля ваенныя:

	да вайны:	у 1923 годзе:
у Беласточчыне было гавец	451,096	277,031
у Віленшчыне (даных ня маем)		154,546
у Наваградчыне	1,569,301	153,172

Лічучы, што з гаўцы ў год атрымліваем 3 кілеграмы воўны, можна мець яснае выабражэньне і аб тым, скольки воўны наш край можа прадукаваць на сваю патрэбу. А з гэтае воўны, апрача рознае тканіны, мы вытваралі значную колькасьць валенак, шапак і г. п.

А лясныя матэрыялы? Іх у нас і сяньня хапае, ня гледзячы на рабункоўую гаспадарку ў нашых лясох. Паводле даваенных даных (гл. „Rocznik Statystyczny" за 1923 г.), лясоў у Зах. Беларусі было:

	у тысяч. гэкт.:	% прастору:
у Беласточчыне	743,6	25,2
„ Віленшчыне	706,7	25,9
„ Наваградчыне	661,1	28,9
„ Палесьсі	1,261,0	30,5

Дык хоць-бы і напалову былі працярэблены ў нас лясы, матэрыялу дзеля хатняе прамысловасьці яны дадуць і цяпер даволі.

Урэшце, гліна. Яе ў нас шмат, дый ёсьць месцамі дужа добрыя гатункі. А тым часам ганчарства ўсё больш занікае ў нас. Цяперашні стан ганчарства ў нас характэрызуецца гэтакімі данымі аб ганчарох. Працуюць ганчары ў такіх мясцовасьцях:

у Дзісьненшчыне:	Ніж (12 ганчароў)
„ Стаўпечыне:	Івенец Ракаў Стоўпцы (6 ганч.)
„ Лідчыне:	у Лябёдзкай гміне „ Ганчарскай „
„ Слонімшчыне:	Дэрэчын
„ Валожыншчыне:	Глыбокае
	І ў е

Так прынамся кажуць вынікі анкеты, зробленай міністэрствам гандлю і прамысловасьці (Wydział drobn. przem. i rzemiosł).

Вось-жа ў кірунку падняцьця і разьвіцьця хатняга промыслу і павінны распачаць энэргічную працу нашы культурныя ўстановы, ня кажучы аб адносных дзяржаўных установах, для якіх гэта зьяўляецца простым абавязкам.

А. Н.

да нейкага паразуменьня паміж Англіяй і Францыяй. Англія, відаць, перапалохалася магчымасьці падпісаньня ўмовы Францыі з Радамі, ды крэпка націснула на Мусоліні, каб—пакуль што—пасядзеў цішэй... Прынамсі найбольш ваяўнічыя органы фашызму адразу зьмянілі тон. Югаслаўскі ўрад таксама пацішэў. Але спрытная італьянская дыпламатыя, ня спыняючы зусім пляновай акцыі ў кірунку захвату Альбаніі, трэбуе цяпер ад югаслаўскага ўраду, каб той прызнаў зацьвярджаньне вельмі карыснай для Італіі тарговай умовы з Югаславіяй, якую заключыў, верачы сьвята ў „прыязьнь“ Італіі, міністар Нінчыч... Ведама, што гэты Нінчыч, пасьля авантуры Мусоліні ў Альбаніі, выйшаў у адстаўку, а парлямант рашуча адмовіўся зацьвердзіць шкодны для краю трактат з Італіяй.

Жанчынам адмовілі палітычных правоў у Францыі.

Як ведама, у Францыі ідзе гарачая барацьба за пераглед закону аб выбарах у парлямант. Паміж іншым, у камісіі, дзе разглядаўся праект ўраду, большасьць галасоў проці 5 адмовіла жанчынам выбарных правоў—як выбіраць, таксама і быць выбранымі ў парлямант... Гэтага жаноцкага бяспраўя, здаецца, ужо няма на ўсім сьвеце, апрача Японіі.

Ізноў паўстаньне ў Гішпанскім Марокко.

Сам гішпанскі дыктатар выдаў адозву, у якой ня толькі сьцьвярджае пачатак новага паўстаньня у Марокко проці гішпанскай улады, але і — рад новых цяжкіх паражэньняў гішпанскіх войск у баях з паўстаўшымі плямёнамі. Паўсталі плямёны, дагэтуль зусім неразброеныя, дык да-Рывэра абяцуе, што — неўзабаве — у 6 — 8 дзён гішпанскія войскі разброяць іх... А пакуль-што паўстанцы так б'юць гэтых „разбраіцеляў“, што яны гінуць зусім — бяз весьці... Нават гішпанскія камунікаты сьцьвярджаюць, што гарнізоны цэлага раду дробных месцаў Марокко папросту цалком выразаны паўстанцамі... Відаць, гішпанцы добра „трыумфавалі“ сваю перамогу — французскімі сіламі над мясцовым насяленьнем...

У Сойме.

Соймавая камісія неафіцыяльна працуе.

29-га сакавіка сабраліся на нараду галоўныя сябры канстытуцыйнай камісіі, якія працавалі над зьменай Выбарнага Закону. Нарада высьветліла плян далейшай працы камісіі. Было пастаноўлена апрацаваць рад праектаў законаў прадбачаных Канстытуцыяй, як—аб саюзах, аб свабодзе прэсы, нятыкальнасьці прыватнай кватэры, тайны карэспандэнцыі (пісьмаў) і т. п.

Успомінаўшы аб гэтай драбніцы—у канцы пятага і апошняга году свайго жыцьця, паны паслы падзялілі між сабой гэту працу, хаця добра ведаюць, што з усяго гэтага нічога-нічагусенька ня выйдзе. Бо—або ўрад ня дасьць скончыць гэтую працу, калі законы будуць, як і самаўрадавы,—„залішне лібэральныя“, або — гэтыя „залішне-лібэральныя“ законы, напісаныя панамі пасламі—„пад выбары“, папросту астануцца на паперы.

Апрача таго, нарада распланавала працу над праектам Выбарнага Закону п. Гломбіньскага. У нарадзе, як піша „Robotnik“, у лічбе „лявіцы“ прымалі ўчасьце і паны пэпээсы.

Аб чым пішуць.

Як працуюць школьныя інспэктары?

Аб тым, як працуюць на мясцох—у Заходняй Беларусі—школьныя інспэктары, і ў штоператвараюцца на дзеле шумныя заявы ўраду аб „толеранцыі“ і „справядлівых адносінах“ да беларускіх нацыянальных патрэб і дамаганьняў у школьным пытаньні, — дае жменю фактаў орган партыі віцэ-прэм'ера Бартля—„Kur. Wil.“—у нумары з гэтае серады. Вось што чытаем у гэтай газэце:

„Інспэктар Прухнік, які працуе ў Браслаўскім павеце, ня толькі не падаў да ведама вучыцялёў цыркуляр віцэ-прэм'ера (аб толеранцыі), але проста пастараўся яго зьвясьці да нуля. Вось, на канфэрэнцыі, скліканай ужо пасьля апублікаваньня цыркуляру, на заяву аднаго з вучыцялёў, п. Богачка, што—каб дзеці лепш разумелі, чаго іх вучаць,—настаўнікі павінны ведаць мяйсцовую мову і пры тлумачэньні карыстацца гэтай мовай,—пан інспэктар з дакорам сказаў: „Мы ашукаліся на вас, пане Богачэк!“—і з таго часу п. Богачку не падае рукі. Вельмі магчыма, што вучыцель Богачэк страціць службу.

„22 га студзеня с. г., — цераз два месяцы пасьля выданьня цыркуляру,—у аднэй із школ Браслаўскага павету (каля Друі) на лекцыі Закону Божага перапалоханыя дзеці заявілі ксяндзу Хамёнку, што мяйсцовы настаўнік загадаў данасіць яму, ці ксёндз будзе карыстацца беларускай мовай пры тлумачэньні катахізму. Калі гэтага загаду ня споўняць, дык пагражаў біцьцём па лапах. Прыперты ксяндзом да сьцяны, настаўнік запярэчыў, што нібы пагражаў біцьцём, аднак прызнаўся, што загадаў дзецям шпігаваць за ксяндзом — на падставе прыказу кіраўніка школы і п. інспэктара Прухніка.

„Ізноў у іншым выпадку вучыцель Панько дастаў вострэ выгавар ад п. інспэктара за тое, што ў часе імшы, якая адбывалася з нагоды першае камуніі дзяцей, пасьля польскае прамовы ня вывеў дзяцей, калі ксёндз да сабраных дзяцей і іх бацькоў пачаў прамаўляць пабеларуску.

„Іншы вучыцель на пахаронах мяйсцовага селяніна, выпаўняючы інструкцыю зьверху, дэманстрацыйна вывеў дзяцей з пахаронаў, як толькі ксёндз распачаў прамову пабеларуску.

„Гэтак мяйсцовая школьная адміністрацыя праводзе ў жыцьцё прынцыпы цыркуляру, які загадвае шанаваць „мяйсцовы язык, культурныя ўласьцівасьці і асаблівасьці“.

„Мы падалі—кажа „Kur. Wil.“—толькі пару прыкладаў, дый то з аднаго павету. Аднак, гэткія рэчы робяцца і ў іншых мясцох. Старая сыстэма — трывае. Ведама, ня дзеецца гэта бяз ведама куратарыуму. Інспэктары на сваю руку на вядзеньне гэткае палітыкі не адважыліся-бы“.

Да гэтых слушных слоў газэты дадамо, што, калі ведае аб гэтым орган пана віцэпрэм'ера Бартля, дык пэўне-ж павінен ведаць і сам пан Бартэль. Дык чаму-ж ён да гэтага дапускае?!..

ШЫЛА з МЯШКА.

25 сакавіка беларускае грамадзянства сьвяткавала дзевяцілецьце абвяшчэньня незалежнасьці **Беларускае Народнае Рэспублікі.** Акт гэты, як ведама, быў скіраваны перадусім проці падпісаньня бальшавіцкім урадам РСФСР міравое ўмовы з немцамі ў Бярэсьці, бо паводле гэтае ўмовы Беларусь аказалася падзеленай на дзьве часьці, адна з якіх аставалася пад Расеяй, а другая адыходзіла ад яе, як частка Літвы.

Ведама, падпісаньне берасьцейскае ўмовы было вынікам аружнае перамогі немцаў над радавай Расеяй. Але ў кожным выпадку акт 25 сакавіка 1918 году нельга разглядаць, як... выяўленьне сымпатыі да бальшавікоў!

Аднак-жа, калі Беларускі Нацыянальны Камітэт склікаў закрытае паседжаньне ў дзень угодкаў гэнага акту і падаў вестку аб гэтым у аднаднёўку „Водлік“,—аднаднёўка за зьмяшчэньне яе была сканфіскавана. Сканфіскавана там-жа і стацьця аб угодках. За тое сама сканфіскаваны і „Народны Звон“. У гэтым улада дагледзіла нешта „антыпаньствовае“ і „бальшавіцкае“. Зусім інакш аднеслася тая-ж улада да блізкіх сэрцу ўраду газэт, як „Беларускі Дзень“, „Сялянская Ніва“ і „Беларуская Крыніца“: у ўсіх трох былі зьмешчаны вялізарныя стацьці аб абвяшчэньні незалежнасьці Беларусі.

Мала таго: тая-ж улада дала дазвол паслу Ярэмічу ўстроіць „урачыстую акадэмію“—ведама, публічную, дый гучны банкет, на якім выступалі паслы Ярэміч і Рагуля — ў прысутнасьці кс. Станкевіча, ды цэлы рад польскіх дзеячоў. А орган міністра Мэйштовіча „Слово“ падаў у нумары з 30 марца абшырную справаздачу аб „урачыстасьці“.

Ужо самы гэты факт сьведчыць аб асаблівай ласцы ўраду да прадпрыемства сельсаюзьнікаў і хадэкаў, уладжанага ў суполцы з рэдакцыяй „Беларускага Дня“—панамі Умястоўскім, Косьцевічам ды Мамонькай. Але й гэтага мала: бо, як падае тое-ж „Слово“, на банкеце былі прачытаны прывітальныя тэлеграмы, сярод якіх — тэлеграма ад прадстаўніка ўраду, дырэктара дэпартаманту рэлігійных вызнаньняў у міністэрстве асьветы, пана Окуліча... Выходзе, што сама ўлада прыняла ўчасьце ў „сьвяце“ хадэкаў і сельсаюзьнікаў!

Гожа было б тут запытацца: дык за што-ж чатыры гады адсядзеў пасол Баран, засуджаны на беластоцкім працэсе за імкненьне да незалежнасьці Беларусі, дый чаму яго хочуць выгнаць з Сойму?—Але нас цікавіць у гэты мамэнт ня гэта, а нешта іншае: іменна тое, што—неўспадзеўкі для самых сябе—сельсаюзьнікі і хадэкі на груньце сьвяткаваньня ўгодкаў абвяшчэньня назалежнасьці Беларусі выявілі свае запраўднае палітычнае абліча...

Шыла заўсёды вылазе з мяшка!

ХРОНІКА.

Суд над рэдактарам Гэрмановічам. Рэдактар даўно зачыненае газэты „Іскра“, Міхал Гэрмановіч засуджаны за газэтныя стацьці „Атручываючыя газы“, „Дары Крэсам“ і „Забойствы“, зьмешчаныя ў №№ 2 і 3 названае газэты, на 10 месяцаў вастрогу.

Трэба адзначыць, што рэд. Гэрмановіч прасядзеў у вастрозе да суда каля 2 гадоў. З гэтага суд залічыў яму толькі 4 месяцы, і яму прыдзецца адбываць вастрожную кару йшчэ ў працягу 6 месяцаў.

Засуджаны падае жалабу і на прыгавор і на тое, што за звальненьне з вастрогу да новага прысуду суд назначыў непамерны залог: 3.000.

Міністар справядлівасьці ў Вільні. У Вільню прыяжджаў мін. справядлівасьці Мэйштовіч, які прымаў учасьце ў зьезьдзе старшыняў акружных судоў.

Запярэчаньне. У газэтах зьявілася вестка аб галадоўцы ў Наваградзкай турме 63 арыштантаў, распачатай на знак пратэсту проці пабіцьця аднаго з арыштантаў паліцыянтам.

Цяпер міністэрства справядлівасьці афіцыяльна запярэчывае гэтай вестцы. Галадоўка, запраўды распачатая, зараз-жа спынілася, калі высьветлілася для арыштантаў беспадстаўнасьць чуткі аб пабіцьці іх таварыша, якая іх так узварушыла...

Непаразуменьні між „сваімі“. „Сялянская Ніва“ ў апошнім нумары падае вестку аб „непаразуменьнях“, якія мелі месца пры ліквідацыі паліцыяй гурткоў „Грамады“. Справа ў тым, што паліцыя так ужо прывыкла глядзець на кожын „гурток“, як на арганізацыю спэцыяльна грамадаўскую,—што, ліквідуючы грамадаўскія гурткі, у некаторых мясцох „удэрыла“ і па зусім легальных і лёяльных гурткох „Сялянскага Саюзу“ і „Інстытуту Беларускае Гаспадаркі і Культуры“. „Сял. Ніва“ адчула вельмі балюча гэтыя акты паліцэйскае самаволі і горача пратэстуе проці яе.

Чарговая лекцыя. У гэту суботу, 2-га красавіка, у 7 гадз. увечары, у памяшчэньні Цэнтральнага Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў Вільні (вул. сьв.-Ганны 2) прачытае лекцыю на тэму **„Што такое дзяржава і як яна стварылася?“**—грам. Л. Мэнке.

Выкрытая ілжа. Ня так даўно „Дзен. Вілен.“ падаў „пэўныя інфармацыі“ — аб тым, быццам сьцьверджана, што забойцамі сям'і Маслоўскіх (у Віленска-Троцкім пав.) былі беларускія сяляне — грамадзісты, якія памсьціліся на Маслоўскім за яго „польскасьць“...

Цяпер сам „Дзен. Віл.“ піша, што „справа забойства сям'і Маслоўскіх высьвятлілася“. Аказываецца, што забілі Маслоўскага і яго сям'ю парабкі Маслоўскага, падгавораныя яго арэндарам Мацкевічам, — палякам, які, атрымаўшы адмову ад Маслоўскага выдаць за яго дачку, зазлаваўся на бацьку і пакляўся адамсьціць.

Так піша цяпер сам п. Обст, але ні адным словам не ўспамінаець аб злоснай ілжы, якую сыпаў нядаўна на беларускіх сялян. Ды сколькі такіх „забойстваў“ нарабілі ўжо грамадзісты — у польскай прэсе!..

„Публічны дом“ газарду... „Дзен. Віл.“ наказуець, што ўначы 28 сакавіка ў так-званай „Беларускай Хатцы“ мела мейсца—нейкая „бурда“, ці папросту — бітва. „Перастрашаная публіка пачала масава ўцякаць з салі йгры“.

„Дакуль-жа гэта ўлады будуць цярпець гэты — „публічны дом“ газарду“? — кліча ўканцы п. Обст.

Цішэй, цішэй, паночку, — гэтая „Беларуская Хатка“, якую вы, пане Обсьце, так неасьцярожна назвалі запраўдным яе імем,—знаходзіцца пад асаблівай апекай вельмі высокіх асобаў. Гэты „публічны дом“, „Беларуская Ноч“ корміць, поіць ды адзявае — большую палову віленскіх беларускіх „палянафілаў“, другую — меншую — палову якіх жывіць і радуе — „Беларускі Дзень“...

Дык папросту — няўдзячнасьць з боку польскай прэсы да гэткай установы, ня кажучы ўжо аб шкодзе, зробленай „высокай палітыцы“.

Афіцыяльны курс грошы на 1 красавіка. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

1./IV на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Калі будуць выбары у самаўрады?

Віцэ-міністар унутраных спраў заявіў, што выбары ў самаўрады, трэба думаць, адбудуцца толькі—у 1928 годзе, пасьля выбараў у парлямант... Бо-ж, калі б навет цяперашні Сойм насьпеў прыняць новы закон аб самаўрадах да сваей сьмерці, дык тады выбары ў самаўрады зыйшліся-бы з выбарамі ў парлямант. А ведама ж, гэта—нядобра, бо тады на гэтыя самаўрадавыя выбары, якія павінны рабіцца зусім спакойна, зрабіла-б непажаданы ўплыў агульная гарачая палітычная атмасфэра, якая заўсёды ствараецца ў часе парляманцкіх выбараў... Дзеля гэтага ўрад ня згодзіцца на адначасныя выбары ў Сойм і ў самаўрады, але змушаны будзе адлажыць апошнія да 1928 г.

Трэба да гэтага дадаць толькі, што ў часе парляманцкіх выбараў, апрача „палітычнай гарачкі“, у краі пануе зазвычай атмасфэра **большай палітычнай свабоды...** А можа гэта ня менш за „гарачку“ шкодзіць камусьці ў часе выбараў у самаўрады?!...

З Таварыства Беларускае Школы.

ЗАЯВА

Мы, сяляне вёскі Новыя-Зімодры, Куранецкае гміны, Вялейскага павету, праз свайго паўнамоцніка Васіля Чабатара, 23 сьнежня 1926 году склалі дэклярацыі пану Школьнаму Інспэктару ў м. Вялейцы, на ператварэньне істнуючай польскай урадовай школы ў вёсцы Журыхах на беларускую ўрадовую школу. 4 лютага 1927 году, едучы праз нашу вёску заступнік войта нашае Куранецкае гміны і якісь прадстаўнік ад школьнай улады, загадалі нам усім дэклярантам зьявіцца ў в. Журыхі ў справе школьнай. Як мы прыйшлі, споўніўшы загад, то прадстаўнік сказаў, што трэба яму знаць, якое сяляне жадаюць школы і ў гэтай справе сьпісаць пратакол ад кожнага дэкляранта. На пытаньне, якой мы жадаем школы, мы адказалі, што жадаем толькі беларускай. Тады прачытаў нейкую паперку, запісваючы імя і прозьвішча, а такжа і імя бацькі, пытаючыся гады дзяцей, на якіх складалі дэклярацыі, потым застаўляў кожнага расьпісывацца на аддзельнай паперцы, якія ў яго былі ўжо надрукованы. Мы ўсе падпісаліся хто-як, а няпісьменныя паставілі крыжыкі і толькі маючы надзею, што ў нас будзе свая родная беларуская школа, бо мы ў-ва ўсім Журыхскім абводзе склалі 32 дэклярацыі на 41 дзіця. Але даходзяць чуткі, што розныя прадстаўнікі школьнай улады, езьдзячы па вёсках, ашуківаюць дэклярантаў, замест беларускай школы, яны застаўляюць падпісывацца напольскую.

Дзеля гэтага ўсе мы ня пэўныя ў тым, што мы падпісалі, можа быць, што і мы засталіся ашуканымі. Лічым толькі праўдзівымі дэклярацыі, складзеныя намі, бо яны толькі і ёсьць напісаны, згодна з нашымі жаданьнямі. На падставе вышэйпададзенага маем гонар прасіць Акружную Управу, як адну праўдзівую абарону культурна-асьветных правоў сялянства, зрабіць захады перад адпаведнымі школьнымі ўладамі, каб яны залічылі праўдзівымі толькі нашыя дэклярацыі, якія мы падалі, згодна з законам аб школьніцтве, а нашы подпісы ўняважніць, калі яны толькі праціварэчаць нашым дэклярацыям. А таксама, каб яны стараліся ператварыць істнуючую ў нас польскую школу на беларускую, што сваімі ўласнаручнымі подпісамі сцьвярджаем.

(—) Андрэй Хадынскі, Петра Бурак, Вінцук Чэбатар, Вінцук Бурак.

Ад Галоўнае Управы Т-ва Беларускае Школы ў Вільні.

Галоўная Управа няраз ужо зьвяртала ўвагу грамадзян, склаўшых дэклярацыі на ўрадовую беларускую школу, на падобную небясьпеку са стараны польскай школьнай адміністрацыі на мясцох, але ашуканствы ўсё паўтараюцца. Вось-жа, друкуючы цэласьцю заяву грамадзян вёскі Вялікія Зімодры, як яскравы прыклад—яшчэ адзін раз зьвяртаем увагу дэклярантаў на падобныя выпадкі, каб былі яны больш асьцярожнымі, каб не падпісавалі ніякіх паперак, прапанаваных рознымі панкамі, пакуль ня выясьніцца, што гэта за паперкі і наагул каб не паддаваліся так лёгка на ашуканства.

Галоўная Управа.

Адчыненьне бібліятэкі-чытальні.

Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Булле Косаўскага павету.

6 сакавіка г. г. адбыўся агульны сход Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Булле, на якім было пастаноўлена адчыніць бібліятэку-чытальню ў в. Булле.

Старшыня Гуртка Нічыпар Нядбальнік у кароткай прамове высьветліў значэньне і патрэбу бібліятэкі і як бібліятэка мае вясьціся. Усе сябры Гуртка Т-ва адгукнуліся спачувала на прызыў старшыні Гуртка і пастанавілі ўсімі спосабамі памагаць бібліятэцы і ў першую чаргу парабіць рэчы патрэбныя ў бібліятэцы, як то сталы, лаўкі і інш. Бібліятэка мае быць адчынена што чацьвер і нядзелю ад 6 да 10 гедз. увечары. Плата за чытаньне будзе брацца наступная: за пажычаньне дамоў—за кожную кніжку па 5 гр., за чытаньне ў чытальні па 30 гр. у месяц з кожнага сябры. Апрача таго было пастаноўлена ўнасіць акуратна і сяброўскія складкі ў Гурток Т-ва, каб даць такім чынам асяродкі на пашыраньне бібліятэкі. Пры гэтым прысутны на сходзе сябра Янка Антонік ахвяраваў 11 кніжак у бібліятэку, на што сход адказаў шчырай падзякай.

Далей сход пастанавіў адчыніць Народны Дом, будынак для якога перарабіць з разваліўшагася грамадзкага будынку і зараз-жа прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё гэтае пастановы.

Сход закончыўся пастановаю ўсімі спосабамі дамагацца роднае беларускае школы.

Першыя крокі.

(Стаўпецкі пав.).

Гуртком Т-ва Беларускае Школы ў в. Скарычы, Ярэміцкае гм. Стаўпецкага павету 7/I—27 г. у доме Б. Сідаровіча быў пастаўлены спэктакль. Згуляны былі пьесы: „Антось Лата“ і „Гандаль 20 га веку“. З прычыны таго, што спэктакль адбываўся ў тую пару, калі па ўсей Заходняй Беларусі ішлі арышты, народу было нямнога: толькі моладзь з азначанай вёскі і бліжайшых вёсак. Вечар скончыўся надта добра. П'есы былі згуляны гэдак добра, што кожны з глядзельнікаў шаптаў адзін аднаму: „Ну і цікавые п'есы і гуляюць, усё роўна, як прафэсіяналы. Вечар закончыўся скокамі пад гукі музыкі.

26 лютага 1927 года ў д. Бірулі адбыўся другі спэктакль. Згуляны былі п'есы: „У кавалёвай хаце“ і „Стараста“. На гэты раз, дзякуючы добрай пагодзе і спакойнаму часу, публікі было надта многа, уся саля была набіта біткам, навет былі паўпанкі з суседніх хутароў. Спэктакль скончыўся пад гукі музыкі раніцай поўным здаваленьнем публікі. На грошы, сабраныя з абодвух спэктакляў, выпісаны кнігі і прыняты належныя крокі да адчыненьня ў в. Скорычы, бібліятэкі-чытальні. Грамадзянства наша складае шчырую падзяку п. п. Б. Сідаровічу і В. Бірулі за пазваленьне ў іх дамох ставіць спэктакль.

Здром.

Культурна-асьветныя справы на мясцох.

× На дзень 6 сакавіка г. г. Управа Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў в. Калазубах, Ражанскае гм., Косаўскага пав. ладзіла вечарыну-спэктакль у м. Косаве ў будынку жыдоўскае прыватнае школы, за каторы ўмовіліся з Управ. Школы 45 злотых і далі задатак. Хацелі адыграць пьесу „Модны Шляхцюк“, „Заручыны Паўлінкі“ і жарт „Зьбянтэжаны Саўка“, на што атрымалі да

звол ад старасты Косаўскага павету. Прыехаўшы ў назначаны дзень у поўным зборы, каб адыграць, Управа школы жыдоўскае адказала, матывуючы тым, што дня 5 сакавіка г. г. атрымана імі пісьмо ад Школьнага Інспэктарату на Косаўскі павет, у каторым забараняе ўсялякія ігры і прадстаўленьні ў школьным будынку.

Па атрыманьні гэтае забароны, мы зьвярнуліся да п. Школьнага Інспэктара з запытаньнем, чаму такі ліст быў падрыхтаваны якраз да таго дня, у які меў адбыцца наш спэктакль, то п. Школьны Інспэктар нам адказаў, што ўжо даўно істнуе на гэта адпаведнае распараджэньне.

Зазначаем, што часьць будынку, у каторым месьціцца школа, спэцыяльна прызначана на мэты тэатральныя і праз увесь час адбываліся ў ім прадстаўленьні: жыдоўскія, стралецкія, а група ўкаінская праз два тыдні вечар у вечар разыгрывала ўсякія пьесы, на каторых часта быў прысутны і сам п. Інспэктар.

Цікава, ці-ж п. Інспэктар, седзячы ў тэатру, ня ведаў, што гэта ў будынку зацьверджаным на школу, ці можа п. Інспэктару прадстаўлялася, што гэта грае дзятва школьная, а ў канцы няўжо-ж п. Інспэктар лічыць беларускую культурную працу „антыпаньствовую" і няўжо-ж п. Інспэктар, убачыўшы нашыя аглашэньні аб тым, што ладзіцца беларускі спэктакль, тагды толькі даведаўся, што ў будынку школьным іграць ня можна?!

× Сяляне в. Журыхі, Куранецкае гм., Вялейскага пав., склалі Школьнаму Інспэктару ў м. Вялейцы дэкляранцыі на ператварэньне істнуючай польскай урадавай школы на беларускую ўрадовую школу.

4-га лютага 1927 г. прыехаў да нас прадстаўнік Школьнай Улады з заступнікам войта Куранецкае гміны і, склікаўшы нас да памешканьня школы, змусіў нас падпісаць якіясь паперы, гаворачы, што мы падпісываем на тое, якой школы мы жадаем—польскай ці беларускай, але мы ўсе сказалі, што толькі жадаем беларускай школы. Дайшлі чуткі да нас, што гэтыя паны прадстаўнікі Школьнае Улады ашуківаюць нас цёмных і несьвядомым сялян, замест таго, каб адчыніць ці ператварыць польскія на беларускія школы, прымушаюць падпісываць якіясь паперы на польскую школу. Бяручы пад увагу, што можа быць і ў нас зроблена такое ашуканства над намі па нашай несьвядомасьці і мы падпісалі паперы нязгодныя з нашымі жаданьнямі. Маем гонар прасіць Акружную Управу зрабіць перад адпаведнымі ўладамі загад, каб яны залічылі праўдзівымі толькі нашыя дэклярацыі, якія мы склалі, згодна з законам аб школьніцтве, а нашы подпісы ўняважнілі, калі яны толькі праціварэчаць нашым дэклярацыям. А таксама, каб яны стараліся ператварыць істнуючую польскую школу на беларускую, што сваімі ўласнаручнымі подпісамі сцьвярджаем.

На арыгінале подпісы: Міхал Міна, Пётра Квяткевіч, Н. Квяткевіч, Язэп Квяткевіч, Наум Клімаў, Аляксей Нарушэвіч, Іван Чарапенка, Міхал Арцюх, А. Бохан.

З Радавае Беларусі.

Дасягненьне беларускага тэатру.

Беларускі тэатр мае ўжо свае слаўныя страніцы ў беларускім адраджэнскім руху. Але ад пачатку гэтага руху будаваньне беларускага тэатру адбывалася выключна рукамі самога беларускага грамадзянства—пры дужа варожых адносінах чужое дзяржавы, якая панавала над нашым краем. Толькі зусім нядаўна—пяць гадоў назад—справа ствараньня беларускага тэатру перайшла ў рукі дзяржаўнае ўлады Радавае Беларусі. 16 верасьня мінулага году мінула роўна пяць гадоў жыцьця першага Беларускага Дзяржаўнага Тэатру ў Менску (другі такі тэатр нядаўна адчынены ў Віцебску), але водгукі гэтага дайшлі да нас толькі цяпер. Дык, хоць спозьнена, пастараемся даць прыблізны падрахунак зробленае Б. Дз. Тэатрам работы—паводле матэрыялаў, апублікаваных у Менскай прэсе.

У канцы 1918 г., як Менск стаўся савецкім, быў заснаваны Белар. Савецкі Тэатр, які праіснаваў да сярэдзіны ліпеня 1919 г., калі настала польская ўлада. Восеньню 1920 г. пасьля новае зьмены ўлады быў абвешчаны т. зв. Дзяржаўны тэатр, у склад якога ўваходзілі тры дзяржаўныя трупы: расейская, беларуская і жыдоўская. 1 жніўня 1921 г. быў заснаваны сучасны Белар. Дзяр. Тэатр, які, маючы новага мастацкага кіраўніка (А. А. Міровіча), распачаў свой першы сэзон 16 верасьня.

Так пераемна складалася папярэдняя глеба, на якой вырас Беларускі Першы Дзяржаўны Тэатр, маючы сваім папярэднікам Беларускі Савецкі Тэатр.

Як той, так і другі, па складу сваіх артыстычных сіл, ня былі тэатрамі прафэсыянальнымі: некалькі чалавек артыстаў з спэцыяльна-тэатральнаю адукацыяй і некаторую прафэсыйна-сцэнічнаю практыкай, а іншыя—маладыя аматарскія сілы, ахвочыя толькі стварыць свой нацыянальны тэатр. Рэпэртуар—невялікі, малады, характэрны для народнага тэатру.

Новы рэжысэр БДТэатру распачаў працу над узьняцьцем на належную вышыню мастацкага боку спэктакляў, павёў навет чыста студыйную працу над новымі п'есамі рэпэртуару гэтага першага сэзону. Пастаноўка „На Купальле" Міх. Чарота паклала ў першым-жа сэзоне працы БДТэатру новы пэрыяд.

Другі зімовы сэзон (1922 23 году) ра-

Чарговыя лекцыі.

Цэнтральны Гурток Т-ва Белар. Школы ў Вільні ладзіць у красавіку наступныя лекцыі:

2-га: Што такое дзяржава, і як яна ўтварылася (грам. М. Мэнке).
9-га: Аб радыо (інж.-электр. А. Трэпка)
30-га: Расейцы і мы (д-р Я. Станкевіч).
У маі (траўні):
7-га: Найнавейшая беларуская паэзія (д-р І. Дварчанін).
14-га: Аўтарскі вечар маладых паэтаў.
21-га: Аб мастацтве (грам. Сергеевіч).
28-га: Вечар пасьвячоны творчасьці Максіма Багдановіча (ў 10 угодкі сьмерці Яго).

Лекцыі адбываюцца па суботам, у 7 гадз. увечары, у памяшчэньні Таварыства (вуліца сьв. Анны 2).

спачаўся перакладною п'есаю Паліванава „Жрэц Тарквіні". Ня гледзячы на нявысокую мастацкую вартасьць гэтае агітацыйнае п'есы (вельмі недынамічны другі акт яе), — увод пляцовак і ўтрымаваны рух масаў з'явіліся навіною ў працы Белар. тэатру і далі пасьпех апошняму ў пашыранае ўжо аўдыторыі. Праваліласяпастаноўка „Ваўкоў" Рам. Ральмана, затое п'еса самога рэжысэра А. Міровіча „Машэка" заняла надоўга значнае месца ў новым беларускім рэпэртуары.

Трэці сэзон 1923-4 году распачаўся п'есаю А. Міровіча „Кастусь Каліноўскі", якая па свайму рэвалюцыйнаму зьместу і добраю мастацкаю ігрою артыстаў заваявала сабе другое месца пасьля „На Купальле" ў рэпэртуары БДТэатру. Чарговы правал адбыўся з п'есаю аднаго маладога белар. артысты, але канец сэзону прынёс выдатны пасьпех пастаноўцы „Мешчаніна ў шляхецтве" Мольера. Белар. тэатр упяршыню ўжыў тут шырокае карыстаньне сходамі, як пляцоўкамі, памастацку ўмеркаванай акрабатыкай, чым выклікаў гострае абурэньне абаронцаў „клясычнасьці" п'есы і гарачае захапленьне гэтым „новым словам" БДТ яго адданых глядзельнікаў.

Чацьверты сэзон (1924 5 г.) прыносіць спозьненую пастаноўку „Панскага гайдука" Наз. Бываеўскага, на якой увага глядзельніка не асабліва затрымалася, і дзьве п'есы, пастаноўка якіх была сьведчаньнем новых дасягненьняў Белар. тэатру.—„Чырвоная маска" (інакшай „Падпальнікі") А. Луначарскага дала магчымасьць шырока выкарыстаць пляцоўкі і рытміку руху актораў на сцэне, а „Каваль-ваявода" А. Міровіча даў узор архітэктурнае будовы сцэны і высшыя прыклады рытмаванага руху пры багатай музычнай аздобе п'есы, якія ў 2-ім акце даюць прыклад высокай дасканаласьці масавага руху.

За 4 гады сваёй папярэдняй працы тэатр заваяваў прызнаньне свае сьпеласьці і мастацкасьці сваіх пастановак, аўдыторыя сталася шырокаю, аднак, мастацкі яе густ і вымаганьні ад рэпэртуару вырасьлі, а апошні паступова заігрываўся і насьпявала патрэба яго значнага абнаўленьня.

Такая задача выпала на пяты сэзон 1925-26 году. Запрошаны тады тэатрам яшчэ адзін рэжысэр—М. А. Папоў распачаў гэты сэзон БДТэатру сваею пастаноўкаю п'есы Кальдэрона „Вясковы судзьдзя" („Алькад з Салямэі"), пазьней ён даў „Жоржа Дандэна" Мольера. Аўдыторыя не задаволілася першаю з названых пастановак, холадна прыняла і другую, хаця частка публікі ацаніла мастацкасьць артыстычнага выкону ў першай п'есе і пышнасьць надворнае аздобы спэктаклю Мольера. „Кар'ера „таварыша" Брызгаліна" А. Міровіча, якая выявіла і здольнасьць тэатру зьдзейсьніць пастаноўку п'есы ў цэлых 18 абразох, — пасьпех мела, аднак, справы сэзону ня выраўняла, і задача абнаўленьня рэпэртуару БДТ цяжкаю спадчынаю перайшла да шостага, сучаснага ўжо сэзону 1926-27 г.

Рэпэртуар сёлета і абнаўляецца сцэне БДТэатру. Глядзельнік утвараецца новы яшчэ і праз юнацкі рэпэртуар тэатру. Палепшаны аркестр, ідуць сымфанічныя канцэрты, рыхтуюцца музычныя драмы. Пасілесы балет БДТ і гатуюцца чыста балетныя пэктаклі тэатру.

Так пракладаюцца новыя сьцежкі для пашыранае працы Беларускага Першага Дзяржаўнага Тэатру. За 5 гадоў папярэдняе працы ён узгадаваў сваю аўдыторыю, мастацкія яго сілы ўмацаваліся, глядзельнік таксама вырас і вымаганьні яго падвысіліся.

Паштовая скрынка.

Я. Анісовічу. Вашы „вершы" далёкі да вершаў. Ня думайце, што вершы пісаць, як рэпу грызьці: пісаць вершы трэба ўмець і мець здольнасьці да гэтага. Лепш пішыце аб Вашым жыцьці і быцьці прозай. — **Сыну Гаспадара.** І да Вас тое самае адносіцца, што да папярэдняга грамадзяніна. — **Сярпу.** Тое, што Вы пішаце, друкаваць ня цікава. Вы думаеце, што лаянка Вашым сябром паможа? Грамадзе не патрэба такіх сяброў, якія так разумеюць справу і свае абавязкі. — **Данілу Сурку.** Тое, аб чым Вы пішаце, зьмяшчаць зусім ня цікава. — **М. Ількоўцу.** Трэба пісаць аб важнейшых рэчах.— **Васілю Сыраквашы.** Ваша паэзія да друку не падыходзіць.— **Касе.** У вершы Вашым слабая тэхніка яшчэ, таму не зьмяшчаем.—**Шпаку.** І Ваша карэспандэнцыя ня цікавая.

Усячына.

Амэрыканская машына на Ленскіх залатых капальнях.

Англа амэрыканская фірма „Лена Гольдфіс" атрымала ў канцэсію (ў арэнду) ад савецкай улады ленскія залатыя капальні ў Сібіры, каб дастаць залатаносны пясок з вялікай глыбіні на дне ракі Лены. Фірма закупіла ў Амэрыцы аграмадную машыну-драгу, якая зараз перавозіцца з Мурманска ў Сібір. Уся гэта машына важыць 3.000 тон (тона-звыш 60 пудоў). Яе мэханізмы будуць рухацца трыма электрамотарамі ў 1.335 конскіх сіл. Энэргія для матароў будзе пастушаць ад трох водна-электрычных станцыяў, якія фірма мае ў верхняй частцы ракі Віціма, прытока р. Лены. Для пагрузкі на параход машыну вязьлі ў 75 таварных вагонах. На капальні машына будзе прывезена сёлетнім летам.

Асьвечваньне дойных кароў.

Ва ўсіх буйнейшых жывёлаводчых раёнах Амэрыкі пачалі шырока ўжываць ультрафіялетавыя прамяньні, якія надзвычайна павялічваюць малочнасьць жывёлы і яе вагу. Дасьледамі ўстаноўлена, што ад штодзённага асьвечваньня кароў у працягу 10 — 15 мінут ультрафіялетавымі прамяньнямі малочнасьць гэтых кароў павялічваецца на 25 процантаў. Ад асьвечваньня корму трываласьць яго таксама значна павялічваецца. Лямпы для ўльтрафіялетавых прамяньняў ужо ўведзены амаль-што ва ўсіх амэрыканскіх фэрмах.

Кран для разгрузкі вагонаў.

На нямецкіх чыгунках устаноўлен кран для мэханічнай выгрузкі вугальля з вагонаў. У Нямеччыне нядаўна пастроены новыя аграмадныя таварныя вагоны, якія зьмяшчаюць 50 тон (звыш 3.000 пудоў) грузу. Новы кран разгружае такія вагоны ў працягу аднэй-дзьвюх мінут, пры чым вугаль перадаецца з вагонаў непасрэдна да катлоў сілавой станцыі.

Паветраныя гіганты.

Пасьля таго, як Нямеччына дабілася ад Антанты скасаваньня забароны будаваць дырыжаблі, там ізноў адраджаецца будаўнічая верф „Цэпэліна". Зараз распачата пабудоўка дырыжабля аб ёмам у 108 000 кубічных мэтраў. Гэты дырыжабль будзе служыць дзеля абсьледваньня паўночнага паветранага шляху. Таксама ў Нямеччыне распрацоўваецца праект аграмаднага дырыжабля Люцгофа, які зможа падымаць 9.500 пуд. грузу.

У Амэрыцы распачата пабудоўка аграмаднага дырыжабля аб'ёмам у 196.000 куб. мэтраў. Гэты паветраны гігант будзе мець 8 матораў у 4.800 конскіх сіл і зможа падняць 100 пасажыраў і да 800 пудоў грузу. Ен можа праляцець без пасадкі 10.000 кілямэтраў (каля 10.000 вёрст), з хуткасьцю 165 кілямэтраў у гадзіву.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.